# ЗАЎТРА -- ДЗЕНЬ АБАРОНЦАЎ АЙЧЫНЫ І ЎЗБРОЕНЫХ СІЛ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ. СА СВЯТАМ!

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт

№ 3 (865) | Аўторак, 22 лютага 1994 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана 50 руб.

## ПА ЗАПРАШЭННЮ НЯМЕЦКІХ МАТЭМАТЫКАЎ

Доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, член-карэспандэнт АН Беларусі рэктар нашага універсітэта Л.А.Шамяткоў набыў шырокае прызнанне сярод алгебраістаў свету. Сведчанне таму -- ганаровы дыплом, які ў канцы мінулага года атрымаў ён з Міжнароднага біяграфічнага цэнтра, што знаходзіцца ў англійскім горадзе Кембрыджы. Пацвярджэннем сказанаму з'явілася і запрашэнне Леаніда Аляксандравіча для выступлення з навуковымі дакладамі ў Германіі. Яно прыйшло з універсітэта г.Кіль, які ўзяў на сябе выдаткі на гэтыя мэты.

У сваіх замежных калег Л.А.Шамяткоў знаходзіўся нядаўна на працягу двух тыдняў. Ён выступіў з навуковымі дакладамі перад вучонымі і навуковымі супрацоўнікамі універсітэцкіх інстытутаў матэматыкі гарадоў Кіль, Білефельд, Майнц. Тут добра ведаюць аб гомельскай алгебраічнай школе,якую ўзначальвае Л.А.Шамяткоў, і многія матэматыкі таксама плённа працуюць у адпаведнай галіне. Гэта спрыяла высокай зацікаўленнасці ўсіх сустрэч, карыснаму абмену вопытам у навуковых даследаваннях і ў канчатковым выніку пасадзейнічае развіццю двухбаковага супрацоўніцтва.

Б.ВАЛОДЗІН.

## ПРЫХОДЗЬЦЕ НА МАСЛЕНІЦУ



27 лютага, у апошнюю нядзелю месяца, студэнцкі клуб "Маладосць" ГДУ праводзіць каля першага корпуса універсітэта традыцыйнае свята провадаў зімы -- Масленіцу і запрашае на яго ўсіх студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў. У яе праграме -- гульні, атракцыёны, частаванне духмянымі блінамі з чаем, продаж сувеніраў, кандытарскіх і кулінарных вырабаў. На свяце выступяць фальклорна-харэаграфічны ансамбль "Радзімічы", іншыя творчыя калектывы клуба мастацкай самадзейнасці ГДУ.

Кульмінацыяй свята стане спальванне саламянага чучала Зімы.

Пачатак -- у 11 гадзін.

Вечарам усе жадаючыя могуць прыйсці патанцаваць на дыскатэку ў фае актавай залы першага корпуса універсітэта. Яна пачнецца ў 19 гадзін.

Прыходзьце на Масленіцу, з вясёлым настроем праводзьце Зіму і сустракайце доўгачаканую Вясну.

Аб выніках зімовай сесіі

## ЗРУХАЎ У ЛЕПШЫ БОК НЯМА

Адзнакі на экзаменах -- красамоўны паказчык узроўню ведаў студэнтаў. Якім жа ён аказаўся пасля прайшоўшай зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі? Прыкметнага, значнага "прагрэсу" у лепшы бок пакуль, на жаль, не бачна. Аб гэтым сведчаць наступныя лічбы: абсалютны працэнт паспяховасці па універсітэту склаў 78,2% /у 1992-1993 навучальным годзе -- 77,2%/.

Змаглі ўтрымацца на ранейшых пазіцыях мінулагодняй зімовай сесіі студэнты гісторыка-юрыдычнага факультэта. Тут паспяховасць склала 71,1%. Але гэтая лічба асаблівага аптымізму выклікаць не можа.

Не намнога палепшылі паказчыкі студэнты філалагічнага, матэматычнага, эканамічнага, біялагічнага, геолага-геаграфічнага факультэтаў.

Пабіў жа ўсе "рэкорды" па ўзроўню ведаў факультэт фізічнай культуры. Паспяховасць яго студэнтаў рэзка пакацілася па нахільнай і склала ўсяго толькі 51,3% супраць мінулагодняй -- 75,3%. Такіх дрэнных вынікаў на гэтым факультэце яшчэ не было. 102 студэнты /каля 30%/ не прымалі ўдзел у сесіі без уважлівых прычын і 51 чалавек /каля 22%/ атрымаў на экзаменах нездавальняючыя адзнакі.

Н.ПАПКОВА, начальнік вучэбнага аддзела

## НА ХЛЕБ БЕЗ...МАСЛА

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прыняў пастанову ад 9 лютага 1994 г. №67 "Аб неадкладных мерах па аказанню фінансавай падтрымкі некаторым катэгорыям грамадзян і асобным галінам эканомікі". Ёй прадугледжана ўстанавіць на люты 1994 г. некаторыя дадатковыя выплаты. У прыватнасці, студэнтам вышэйшых навучальных устаноў, навучэнцам сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў, якія не атрымоўваюць харчавання, у тым ліку хто знаходзіцца ў акадэмічных водпусках па медыцынскіх паказаннях, дадаткова да стыпендыі выплаціць па 15 тыс. руб.

Грамадзянам, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, указаныя сумы не выплачваюцца.Ну што, як кажуць, -- 15 тыс. таксама хлеб, хаця для многіх і без масла.

МІЖНАРОДНЫЯ КАНФЕРЭНЦЫІ

## ПРАДСТАЎЛЯЛІ РЭСПУБЛІКУ БЕЛАРУСЬ

Чатыры дні на востраве Гвадэлупа /Францыя/ працавала VIII Міжнародная канферэнцыя па фотаакустычных і фотатэрмічных з'явах. Яна сабрала больш двухсот вучоных з многіх вядучых краін свету, якія плённа вядуць навуковыя даследаванні ў названым раздзеле фізікі. Ад Рэспублікі Беларусь у рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел прарэктар па навуковай рабоце доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар А.М.Сердзюкоў і кандыдат фізіка-матэматычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Г.С.Міцюрыч з нашага універсітэта. Імі было прадстаўлена на канферэнцыю два навуковыя даклады, сааўтарамі якіх з'яўляюцца асістэнт кафедры оптыкі кандыдат фізіка-матэматычных навук В.П.Зялёны і аспірант П.У.Астахаў. Тэзісы дакладаў міжнароднай канферэнцыі апублікаваны.

## ДА ВЫНІКАЎ САМААТЭСТАЦЫІ ФАКУЛЬТЭТАЎ І КАФЕДР

# АРЫЕНЦІР -- НЕ ЎЧАРАШНІ, А БУДУЧЫ ДЗЕНЬ

**М.Селькін, першы прарэктар, прафесар**

Многае з таго, што мы цяпер робім, магчыма, успрымаецца як "чарговая кампанія". Каб адказаць на пытанне, ці адносіцца да такіх праведзеная ва універсітэце самаатэстацыя факультэтаў, звернемся хаця б да новага палажэння аб ВНУ рэспублікі. У гэтым дакуменце чотка запісана, што вышэйшая адукацыя ў Беларусі з'яўляецца двухузроўневай і што права на падрыхтоўку бакалаўраў і магістраў даецца па выніках атэстацыі. Адсюль серыя пытанняў: быць ці не быць ВНУ, факультэту, кафедры, спецыяльнасці? Усе яны зводзяцца да аднаго: якой павінна быць мадэль сучаснага спецыяліста?

З усёй шматлікасці пунктаў гледжання, бадай, тут найбольш выразныя два: адны выступаюць прыхільнікамі арганізацыі навучальнага працэсу па прынцыпу вузкага прафесіяналізму, абгрунтоўваючы гэта паглыбленнем дыферэнцыяцыі навук, павелічэннем аб'ёму ведаў, другія, наадварот, сцвярджаюць, што ва ўмовах дынамізма навуковых ведаў, спецыялісты шырокага профілю, якія валодаюць фундаментальнай навуковай падрыхтоўкай, функцыянальна мабільныя, здольныя хутка адапціравацца да змянляльнай навукова-тэхнічнай абстаноўкі, патрэбны грамадству як паветра неабходна ўсяму жывому.

Можна, канешне, спрачацца, якая з гэтых дзвюх канцэпцый або нейкая трэцяя знойдзе рэальныя ўвасабленні. Але адно, думаецца, ясна ўжо сёння: пацярпела поўны крах косная традыцыя вышэйшай школы -- прыпадабленне студэнтаў "сасуду", які неабходна напаўняць.

Аптымізацыя навучальнага працэсу, пошук новых форм і метадаў навучання -- усё гэта цяпер павінна быць нацэлена на максімальную актывізацыю творчых сіл студэнтаў, на ўзмацненне іх прафесіянальнай падрыхтоўкі, развіццё здольнасцей і задаткаў.

Можна адразу сказаць: атэстацыя паказала, што на кожным факультэце, на кафедрах ёсць шмат нявырашаных праблем, а ў шэрагу структурных падраздзяленняў іх наогул як быццам не заўважаюць.

Пачынаючы атэстацыю, мы на першым яе этапе сфармулявалі наступныя тры раздзелы.

*1. Якасць падрыхтоўкі спецыялістаў*

На ўсіх факультэтах па рэкамендацыі навукова-метадычнага савета універсітэта былі праведзены розныя кантрольныя мерапрыемствы па вызначэнню ўзроўню ведаў студэнтаў.

На матэматычным факультэце праводзіліся кантрольныя работы на трэцім курсе па вучэбнаму матэрыялу другога курса і на пятым -- па матэрыялу чацвёртага курса. На трэцім курсе з трыццаці чалавек з заданнем па матэматычнаму аналізу справіліся толькі восем. А на пятым курсе выявіліся і такія студэнты, якім не пад сілу аказаліся задачы школьнага зместу.

Аналіз работ студэнтаў першага курса па алгебры засведчыў, што карані іх памылак крыюцца ў нізкай тэхнічнай школьнай падрыхтоўцы. Прыкладна такі ж вывад зроблены і пры аналізе работ па кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў.

Варта адзначыць, што правядзенне кантрольных работ па матэрыялу, які вывучаўся на ніжэйшых курсах, на матфаку практыкуецца ўжо не першы год. Гэта практыка дае адпаведным кафедрам матэрыял для канкрэтных дзеянняў па ўдасканаленню навучальнага працэсу. Такая форма метадычнай дзейнасці заслугоўвае шырокага ўкаранення.

Цікавы факт даў нам і аналіз кантрольных работ фізічнага факультэта. Усе студэнты першага і другога курсаў, якія закончылі базавую школу №56, або вочна-завочную Буда-Кашалёўскую школу ці ВВК пры кафедры фізічнай метралогіі, паспяхова справіліся з атэстацыйнай кантрольнай работай. Адсюль нельга не зрабіць вывад, які тычыцца ўсіх факультэтаў: развіццю і ўмацаванню падобных каналаў накіравання якасных абітурыентаў варта ўдзяліць самую сур'ёзную ўвагу.

Пры правядзенні кантрольных мерапрыемстваў на факультэце фізічнай культуры адзначаны недахопы метадычнага характару /плаванне, лёгкая атлетыка/.

Упершыню атэстацыйныя кантрольныя работы праводзіліся на філалагічным і гісторыка-юрыдычным факультэтах. Іх вывад: праводзіць такія работы мэтазгодна рэгулярна з абмеркаваннем вынікаў іх аналізу на пасяджэннях кафедр і саветаў факультэтаў.

На жаль, у справаздачах эканамічнага, біялагічнага і геолага-геаграфічнага факультэтаў прыведзены толькі статыстычныя дадзеныя і адсутнічае якасны аналіз атэстацыйных кантрольных работ. Больш таго, яны ацэньваліся вельмі добра, што не можа не насцярожыць.

Магчымая канкурэнцыя ВНУ за рынкі збыту выпускнікоў патрабуе ад нас перагляду многіх традыцый: напрыклад, імкненне вымяраць эфектыўнасць навучання ў ВНУ толькі па выніках паспяховасці, г.зн. па адзнаках, якія з'яўляюцца ў залікоўцы студэнта пасля чарговай сесіі. Галоўны недахоп гэтай знешне паспяховай канцэпцыі заключаецца ў адсутнасці арыентацыі на "канчатковы вынік", маладога спецыяліста, адзнаку якому за сценамі ВНУ выстаўляе самы строгі экзаменатар -- само жыццё.

Гэтыя думкі яшчэ раз падводзяць нас да неабходнасці памнажаць розныя формы атэстацыі студэнтаў у міжсесійны перыяд. У прыватнасці таму атэстацыйныя камісіі правяралі наяўнасць на кафедрах фонду кантрольных заданняў па дысцыплінах і спецыяльнасцях. І выявілася, што на геолага-геаграфічным факультэце, напрыклад, нават не ведалі, што гэта такое. Не аказалася фонду кантрольных заданняў па дысцыплінах і спецыяльнасцях пад час правядзення атэстацыі ні на адной кафедры гісторыка-юрыдычнага факультэта. Вучэбнаму аддзелу праз пэўны час неабходна правесці праверку кафедр па ўказанаму напрамку работы.

Як паказала атэстацыя, а дакладней -- выбарачны аналіз курсавых работ -- тут таксама не ўсё ў парадку. Так, аналіз курсавых работ па тэорыі фізічнага выхавання і па павышэнню спартыўнага майстэрства засведчыў, што многія з іх носяць рэфератыўны характар, вывады -- апісальныя. Жадае лепшага і само афармленне.

Аналагічныя заўвагі можна зрабіць у адрас эканамічнага і некаторых іншых факультэтаў.

Цяпер аб дыпломных работах. Атэстацыйныя камісіі тут карысталіся толькі справаздачамі старшынь ДЭК, якія на некаторых факультэтах паўтараюцца з году ў год. Самы істотны недахоп -- прыкметнае зніжэнне колькасці дыпломных работ, рэкамендаваных да ўкаранення. А гэта якраз прыклад якаснай ацэнкі выпускаемага спецыяліста, а не ацэнкі ў балах.

*2. Вучэбна-метадычная работа*

Па гэтаму раздзелу камісія перш за ўсё знаёмілася з ходам выканання "Закона аб мовах у Рэспубліцы Беларусь". Найбольш паспяхова работа вядзецца, натуральна, на філалагічным факультэце. На гісторыка-юрыдычным факультэце Закон ажыццяўляецца нераўнамерна. Тут на пяці кафедрах толькі адзінаццаць выкладчыкаў чытаюць курсы на беларускай мове, у тым ліку на кафедры гісторыі Беларусі -- шэсць з пятнаццаці.

Ёсць прыклады чытання лекцый на беларускай мове для студэнтаў факультэта фізічнай культуры. Сярод кафедр прыродазнаўчых факультэтаў можна выдзеліць кафедру батанікі і фізіялогіі раслін. Як выявіла атэстацыйная камісія, на многіх кафедрах выкладчыкі добра ведаюць беларускую мову, але ў якасці асноўнага матыву, чаму не выкарыстоўваюць яе на лекцыях, ставяць тое, што адсутнічаюць падручнікі на роднай мове. Аднак нельга пагадзіцца, што гэта галоўны фактар.

У ходзе атэстацыі правяраліся расклад заняткаў, якасць вучэбных і рабочых планаў. На здзіўленне, ні ў адной са справаздач няма фактаў удасканальвання вучэбных і рабочых планаў. Даследаванне гэтага пытання выглядае прыкладна так: "расклад вучэбных заняткаў нармальны. Вучэбныя планы і рабочыя праграмы ёсць".

Між тым, тут не ўсё ў парадку. Напрыклад, жадае быць на больш высокім узроўні матэматычная падрыхтоўка будучых эканамістаў, бо ў наш час, калі надзвычай шырока і ўсебакова прымяняюцца вылічальная тэхніка і эканоміка-матэматычныя метады, эканамісту недастаткова мець толькі агульнае ўяўленне аб гэтых навуках.

Найбольш крытычны падыход праяўлены камісіяй на гісторыка-юрыдычным факультэце, дзе мяркуюць, што не ўсё добра з праграмай па гісторыі Беларусі, кажуць, што няма канцэпцыі гістарычнай адукацыі, няма праграм. Але працаваць трэба -- трэба думаць. Калі ў бліжэйшы час на факультэце гэтае пытанне не атрымае ўзгаднення, то, відавочна, давядзецца яго абмяркаваць на вучоным савеце універсітэта.

Спецыяльнасць гісторыка мае ў дастатковай ступені кропкі сутыкнення з сацыялогіяй, эканомікай, кіраваннем, што забяспечыла выпускнікам факультэта патэнцыяльныя магчымасці для больш шырокага выбару сфер працы за межамі іх асноўнай прафесіі -- настаўніка.

Падобную задачу павінны паставіць перад сабой і іншыя факультэты, асабліва тыя, якія рыхтуюць педагогаў.

Усе мы павінны разумець, што сёння для вырашэння задачы інтэнсіфікацыі навучальнага працэсу адных толькі традыцыйных форм і метадаў навучання -- лекцый, семінараў і ім аналагічных -- недастаткова. Пасіўная роля студэнта ў навучальным працэсе не фарміруе ў ім, напрыклад, такой якасці, як здольнасць самастойна знаходзіць рашэнні ўзнікаючых творчых задач. А гэта ж неабходны элемент якаснай падрыхтоўкі сучаснага спецыяліста.

Нарэшце, аб узаеманаведванні заняткаў. Трэба сказаць прама: на большасці кафедр гэта форма метадычнай работы або забыта зусім, або ажыццяўляецца фармальна. Аналіз справаздач атэстацыйнай камісіі паказвае, што на некаторых факультэтах узаеманаведванне вучэбных заняткаў у шырокім сэнсе ставіцца пад сумненне. Пазіцыя рэктарата супрацьлеглая такому пункту гледжання. Мы разглядаем гэтую работу і як форму кантролю якасці вучэбнага працэсу, і як школу для маладых выкладчыкаў, і як форму стымулявання прафесіянальнага росту для ўсіх выкладчыкаў незалежна ад стажу і ўзросту.

Атэстацыя засведчыла, што дэканы факультэтаў недастаткова глыбока і ўсебакова кантралююць стан вучэбна-метадычнай работы на кафедрах, хаця гэта адзін з самых важных момантаў у іх функцыянальных абавязках.

*3. Навукова-педагагічныя кадры*

На сённяшні дзень неўкамплектаванасць кафедр кадрамі значная. Аднак на асобных кафедрах вельмі пасіўна вядзецца іх падрыхтоўка. Акрамя камплектаванпя кафедр існуе пытанне аб эфектыўным выкарыстанні кадравага патэнцыялу. На гэтым і канцэнтравала, перш за ўсё, сваю ўвагу атэстацыйная камісія.

Так, на кафедры радыёфізікі працуюць штатнымі толькі чатыры выкладчыкі з сямі. Сярод штатных два дацэнты і столькі ж старшых выкладчыкаў. За гады існавання кафедры тут не падрыхтавана ніводнага кандыдата навук.

На многіх выпускаючых кафедрах вельмі цяжкім стаіць пытанне аб размеркаванні выпускнікоў на работу. Гэта патрабуе новых падыходаў у сучасны момант для рашэння гэтай праблемы.

На парозе змены пакаленняў стаяць многія кафедры універсітэта. І трэба зрабіць усё, каб гэты працэс прайшоў без болю і не адбіўся адмоўна на вучэбным працэсе універсітэта.

Недастаткова эфектыўна выкарыстоўваецца кадравы патэнцыял універсітэта. Так, на кафедры матэматычнага аналізу не змаглі знайсці прафесійнага рашэння па размеркаванню вучэбнай нагрузкі, што прывяло да канфліктнай сітуацыі і стварыла на кафедры нездаровую псіхалагічную атмасферу.

На некаторых кафедрах вялікую лекцыйную нагрузку выконваюць асістэнты і адначасова яна намнога меншая ў асобных кандыдатаў навук, дацэнтаў.

Амаль на ўсіх кафедрах слаба праводзіцца практычная работа па перспектывах развіцця і, у прыватнасці, яе перапрафіліраванню. Лёс жа кафедры, зразумела, у многім залежыць ад ініцыятывы яе загадчыка.

Трывожыць кадравая сітуацыя на тых кафедрах, дзе нізкі працэнт выкладчыкаў з вучонымі ступенямі і званнямі.

Падводзячы вынікі праведзенай самаатэстацыі факультэтаў і кафедр, неабходна адзначыць наступнае. Ні ў якой меры не ставілася мэта параўнаць факультэт або кафедры, сказаць, што адны лепшыя, а другія горшыя. Галоўнае -- самім убачыць свае недахопы, дакладна сфармуляваць для сябе задачы і вызначыць шляхі іх вырашэння з тым, каб дзяржаўная атэстацыя Міністэрства адукацыі прайшла паспяхова. Трэба ўсвядоміць, што менавіта ад яе будзе залежыць наша будучыня. Размова пойдзе не толькі аб лёсе факультэтаў, кафедр, спецыяльнасцей і спецыялізацый, але і кожнага выкладчыка. Нягледзячы на цяжкасці сённяшняга жыцця, складанасці грамадскай сітуацыі, мы з гонарам павінны выконваць сваю прафесійную справу, бо кожнаму з нас зразумела роля інтэлігенцыі ў нацыянальным адраджэнні Беларусі. Вось чаму давайце зробім усё магчымае, каб наш універсітэт заняў дастойнае месца на "вузаўскім Алімпе" рэспублікі.

Я ўдзячны ўсім членам атэстацыйнай камісіі, намесніку старшыні навукова-метадычнага Савета універсітэта Л.Я.Палякову за праведзеную работу і спадзяюся на яе паспяховы працяг.

## ДАСТОЙНА СУСТРЭНЕМ 25-ГОДДЗЕ УНІВЕРСІТЭТА

# ДНІ КАФЕДРЫ Ў ІНТЭРНАЦЕ

У студэнцкім інтэрнаце №4 на Валатаве прайшлі Дні кафедры заалогіі і аховы прыроды.

У апошнія гады ў студэнцкім інтэрнаце выкладчыкі, на жаль, сталі рэдкімі гасцямі. Таму маляўнічыя аб'явы названай кафедры аб плануемых мерапрыемствах у Валатаўскім інтэрнаце выклікалі цікавасць у студэнтаў.





Яркае ўражанне пакінула сустрэча з цікавымі людзьмі, якія жывуць у нашым горадзе. Гэта ўласны карэспандэнт "Народнай газеты" па Гомельскай вобласці Анатоль Іванавіч Гатоўчыц, які шырока вядомы сваімі вострымі артыкуламі, фельетонамі; Аляксандр Аляксандравіч Маляроў -- добры музыкант, удзельнік квартэта баяністаў Гомельскага музвучылішча; Леанід Пятровіч Кузьміч -- кандыдат філалагічных навук з кафедры беларускай мовы нашага універсітэта.

На сустрэчы прысутнічалі дэкан біялагічнага факультэта С.Ф.Алешка, загадчык кафедры заалогіі і аховы прыроды А.В.Гаўрылаў, старшы куратар С.У.Аўсеенка, прафесар кафедры батанікі і фізіялогіі раслін В.В.Валетаў, студэнты 1-5 курсаў біялагічнага і студэнты 5 курса фізічнага факультэтаў.

А.І.Гатоўчыц расказаў студэнтам аб "Народнай газеце", аб тым, як рыхтуецца выпуск нумара, збіраецца матэрыял для артыкулаў, фельетонаў, карэспандэнцый. З цікавасцю слухалі прысутныя аб прафесіі журналіста, праблемах і перспектывах "Народнай газеты".

А.А.Маляроў расказаў аб вядомым у Гомелі, Рэспубліцы Беларусь і за іх межамі квартэце баяністаў музычнага вучылішча імя Сакалоўскага. Гісторыя гэтага калектыву -- гэта рэпетыцыі, выступленні, шматлікія гастролі. Гомельскія баяністы выступалі ў Францыі і Польшчы. Іх канцэрты заўсёды праходзяць з вялікім поспехам. У праграме канцэртаў -- творы розных аўтараў, народная і класічная музыка. Студэнты, якія прысутнічалі на сустрэчы, праслухалі фанаграму канцэртных запісаў музычнага квартэта.

Л.П.Кузьміч прачытаў лекцыю на вельмі цікавую і змястоўную тэму "Мова -- гісторыя -- народ".

Праведзены вечар сустрэчы быў вельмі цікавым і змястоўным.

**В.ТАЛКАЧОЎ**, дацэнт; **А.ЖУК, М.МОХАРАЎ**, асістэнты кафедры заалогіі і аховы прыроды.

На здымках: Госці студэнтаў журналіст А.І.Гатоўчыц і музыкант А.А.Маляроў.

Фота У.Чысціка



### ЗААЛОГІЯ -- ГЭТА ПОШУК

На такую тэму адбылася гутарка са студэнтамі біялагічнага факультэта, якая праходзіла ў інтэрнаце ў рамках Дзён кафедры заалогіі і аховы прыроды. Будучыя біёлагі даведаліся шмат новага аб экспедыцыях кафедры заалогіі ў 1975-87 гг. у Калмыкію, Кіргізію, Крым, на Каўказ, у дэльту Волгі, а таксама правядзенні практык і экспедыцый на тэрыторыі Беларусі -- на Прыпяці, Беразіне, Дняпры, Сожы, у Прыпяцкім, Бярэзінскім запаведніках, Нацыянальным парку "Белавежская Пушча".

Гутарка суправаджалася паказам арыгінальных каляровых слайдаў.

**В.ВЕРАМЕЕЎ**, дацэнт, **А.КУСЯНКОЎ**, ст. выкладчык.

# МЕРАПРЫЕМСТВЫ

### па святкаванню 25-годдзя Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Францыска Скарыны

1. Скласці спіс гасцей, паслаць запрашэнні
   ВОІНАЎ М.М., УСОВІЧ К.С.
2. Сустрэча гасцей, размяшчэнне ў гасцініцы, набыццё білетаў
   КАРМАЗІН А.П., ГАПЕЕЎ В.П.
3. Забеспячэнне святочных мерапрыемстваў транспартам
   ПАЛЕВІКОЎ У.М.
4. Арганізацыя ўрачыстага пасяджэння, святочнага канцэрта і вячэры
   СЕЛЬКІН М.В., ВОІНАЎ М.М., КАРМАЗІН А.П.
5. Набыццё сувеніраў для ганаровых гасцей
   ПАЛЕВІКОЎ У.М., КУРАВА І.А.
6. Прадстаўленне супрацоўнікаў, студэнтаў на ўзнагароды
   КАРМАЗІН А.П.
7. Падрыхтоўка даклада на ўрачыстае пасяджэнне
   ВОІНАЎ М.М.
8. Стварэнне сцэнарыя ўрачыстага пасяджэння, канцэртнай праграмы
   ВОІНАЎ М.М., ЛЫСЯНКОЎ А.В.
9. Падрыхтаваць шэраг публікацый для газеты "Гомельскі універсітэт" пад агульным загалоўкам "Я і універсітэт", куды ўвойдуць успаміны пісьменнікаў і паэтаў, якія вучыліся ў ГДУ
   БАЛОГА У.П.
10. Выдаць мастацкі зборнік "Універсітэт паэтычны" (на аснове папярэдніх публікацый)
    ВОІНАЎ М.М., ЯРАЦ В.У.
11. Выдаць падрыхтаваны фальклорны зборнік лепшых узораў вуснай народнай творчасці, сабраных студэнтамі за 25 год
    ШТЭЙНЕР І.Ф.
12. Арганізаваць шэраг святочных сустрэч з паэтамі і празаікамі, выпускнікамі ГДУ розных гадоў.
13. Правесці выставу "Палескія ўзоры", цыкл лекцый для выкладчыкаў і вучняў сярэдніх школ аб універсітэце.
14. Правесці рэспубліканскую канферэнцыю "Рэгіянальныя асаблівасці моў літаратур і фальклору (зацверджана Міністэрствам)
    ЕЎТУХОЎ У.Д.
15. Правесці круглы стол "Пуцявінамі адраджэння"
    ВОІНАЎ М.М., ЕЎТУХОЎ У.Д., КОВАЛЬ У.І.
16. Правесці І Рэспубліканскую навуковую канферэнцыю "Роля Скарыны ў адраджэнні нацыянальнай культуры"'
    ВОІНАЎ М.М., АНІЧЭНКА У.В., УСОВІЧ К.С.



СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

# МАРШАЛ М.М.ТУХАЧЭЎСКІ Ў ГОМЕЛІ

У Дзяржаўным архіве Гомельскай вобласці захоўваюцца дакументы, звязаныя з імем маршала М.М. Тухачэўскага. Адносяцца яны да перыяду знаходжання Тухачэўскага на пасадзе камандуючага войскамі Заходняга фронту /1922-1924 г.г./. Гэта яго тэлеграмы ў адрас Гомельскага губвыканкама, перапіска партыйных і савецкіх органаў з камандуючым фронтам, пратаколы пасяджэнняў Гомельскага губернскага бюро шэфаў пры губвыканкаме і інш. У гэты перыяд многія злучэнні войск Заходняга фронту дыслацыраваліся на тэрыторыі Гомельшчыны. Шэфства над гэтымі воінскімі часцямі ажыццяўляў Гомельскі губвыканкам, які аказваў вялікую дапамогу ў забяспячэнні часцей прадуктамі і фуражом, расквартыраванні воінскіх часцей, прадастаўленні кватэр каманднаму і палітычнаму саставу Чырвонай Арміі. М.М.Тухачэўскі заўсёды клапаціўся аб умацаванні радоў Чырвонай Арміі, аб быце і паўсядзённым жыцці чырвонаармейцаў. Так, у загадзе ад 18 снежня 1922 г. гаварылася: "При объезде в ноябре и декабре с.г. мною подробно осмотрены казарменные помещения в Полоцке, Витебске, Минске, Бобруйске, Гомеле и Брянске.

Благодаря отзывчивости и щедрой поддержке Совнаркома Белоруссии и губисполкомов: Витебского, Гомельского и Брянского -- казармы в вышеуказанных пунктах заново отремонтированы и снабжены необходимым для повседневного обихода инвентарем.

Уверен, что при дальнейшей поддержке Совнаркома Белорусии, губисполкомов и уисполкомов войсковые части фронта будут иметь возможность и средства всецело посвятить себя боевой подготовке..."

Гомельскі губвыканкам рабіў шмат для задавальнення патрэб Чырвонай Арміі. Так, 5 ліпеня 1923 г. на пасяджэнні губернскага бюро шэфаў пры губвыканкаме быў заслуханы зварот камандуючага Заходнім фронтам М.М.Тухачэўскага да прэзідыума губвыканкама аб прыняцці магчымых мер у бягучы будаўнічы сезон па рамонту і абсталяванню казарм да зімы. Бюро пастанавіла: "Обращение тов. Тухачевского принять к сведению. Работу по ремонту и оборудованию казарм возложить на бюро шефов".

Гомельскі губвыканкам у дакладной запісцы ў Савет Працы і Абароны 21 лістапада 1923 г. паведамляў: "Выполнив арендные обязательства перед губземуправлением, губпродком сконцентрировал до одного миллиона пудов хорошего, кондиционного качества сена, которое передается Военводу.

Таким образом, взятая губисполкомом линия целиком оправдалась и нужды Красной Армии в сене удовлетворены, что с удовлетворением было констатировано командзапом т. Тухачевским, т. Буденным..."

Аб дапамозе, якую аказалі працоўныя Гомельшчыны Чырвонай Арміі, сведчыць і наступны загад М.М.Тухачэўскага ад 8 жніўня 1923 г.: "Объявляя при сем выписку из протокола заседания бюро Гомельского губкома РКП/б/ о политическом состоянии кавдивизии, об оказании необходимой помощи в ремонте казарм, заготовке постельных принадлежностей, пополнении дивизий членами РКСМ, об улучшении закрепления шефской связи и укомов с частями, командование и политическое управление фронта отмечают вполне правильный подход Гомельского губкома в деле оказания помощи и связи такового с Красной Армией и выражают надежду, что остальные губкомы подойдут также внимательно, отзывчиво к запросам Красной Армии".

Вялікую цікавасць уяўляюць 2 лісты на імя старшыні Гомельскага губвыканкама, падпісаныя асабіста М.М.Тухачэўскім. У лісце ад 26 чэрвеня 1923 г. Тухачэўскі піша, што крэдыты на будаўнічыя работы скарочаны і таму ён просіць аказаць садзеянне Чырвонай Арміі ў правядзенні рамонтна-будаўнічых работ. Ліст заканчваецца наступнымі словамі: "Я глубоко убеждён, уважаемый товарищ, что мой призыв не останется без отклика и Вы примете все меры к тому, чтобы избавить армию от того бедствия, которое ее ожидает в настоящую зиму, и в полной мере окажете Вашу помощь".

Другі ліст ад 11 жніўня 1923 г. наступнага зместу: "Крайний недостаток материальных средств для поддержания на должной высоте политико-просветительной и военно-научной деятельности среди войск Западного фронта заставляет меня вновь обратиться к Вам с просьбой об отпуске ежемесячно из средств губисполкома и шефских для указанной цели 400 руб. золотом, как об этом мы договаривались с Вашим заместителем тов. Дубина.

Прошу отпускаемые средства передавать местному губвоенкому для дальнейшего направления их в штаб фронта".

Захаваныя дакументы сведчаць аб вялікім клопаце М.М.Тухачэўскага аб воінах Чырвонай Арміі, аб цеснай сувязі арміі і народа.

**В.ЛУГАЎСКАЯ**, заг. аддзела Гомельскага аблдзяржархіва.

### АБ'ЯЎЛЯЕЦЦА КОНКУРС

Ва універсітэце аб'яўляецца конкурс 1994 года на лепшыя навукова-даследчыя работы прафесарска-выкладчыцкага і навуковага саставу, выкананыя за апошнія 2-3 гады. Пераможцы конкурсу выступяць з навуковымі дакладамі на штогадовых Скарынаўскіх навуковых чытаннях, ім будзе прысвоена званне лаўрэатаў Скарынаўскіх чытанняў.

Даведкі па тэл. 56-73-38, інфармацыйная служба НДС, 5-ы корпус, аўд. 5-13.

### ПРЫХОДЗЬЦЕ ДА НАС З ІДЭЯЙ

2,6 мільярда рублёў будзе выдзелена дадаткова з дзяржаўнага бюджэту ў фонд фундаментальных даследаванняў Рэспублікі Беларусь. А агульная сума падтрымкі вялікай навукі ў гэтым годзе складзе больш 60 мільярдаў.

Наша рэспубліка па колькасці насельніцтва не ўступае Грэцыі, але мае ў 20 разоў большую колькасць навуковых кадраў, - расказвае дырэктар фонда Эдуард Васільеў. Патэнцыял гэты высокі і якасцю. Асабліва вядомы ва ўсім свеце дасягненні беларускіх матэматыкаў і фізікаў. Наша задача -- не толькі падтрымаць, але і стымуляваць развіццё навуковага комплексу. Адна з мер -- конкурс новых унікальных ідэй, якія мы праводзім рэгулярна. Зараз ідзе прыём заяў на ўдзел у конкурсе "Навука-94". Лепшыя праграмы, выдзеленыя саветам фонда, будуць прадстаўлены для фінансавання.

/Газета "Рэспубліка"/.

СПОРТ

## У ДЗЕСЯТЦЫ МАЦНЕЙШЫХ

Спартыўныя спецыялісты, трэнеры і журналісты па традыцыі вызначылі дзесяць лепшых спартсменаў Гомельшчыны па выніках іх выступленняў у 1993 годзе. Фотаздымкі мацнейшых змешчаны ў "Гомельскай праўдзе" за 8 лютага г.г.

У апублікаваным матэрыяле адзначаецца, што мінулы спартыўны год быў насычаны спаборніцтвамі самых розных узроўняў. Шмат перамог і высокіх дасягненняў на рахунку спартсменаў Рэспублікі Беларусь, якія прадстаўляюць новую незалежную дзяржаву ў свеце. Аматараў спорту парадавалі і спартсмены Гомельшчыны. У дзесятку мацнейшых увайшло сем прадстаўнікоў нашага універсітэта. Перш за ўсё хочацца зазначыць, што сярод іх і выкладчыца кафедры фізічнай культуры майстар спорту па паліатлону чэмпіёнка свету Галіна Галаўнёва. Сярод студэнтаў факультэта фізічнай культуры стацыянарнага і завочнага навучання заслужаныя майстры спорту па вольнай барацьбе сярэбраны прызёр чэмпіянату свету Вугар Аруджаў, сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы Сяргей Смаль /выпускнік 1993 г./, бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы па плаванню заслужаны майстар спорту Алена Рудкоўская, майстры спорту міжнароднага класа па скачках на батуце, сярэбраны прызёр Кубка свету Руслан Кашперка, бронзавы прызёр чэмпіянату свету Наталля Карпянкова, майстар спорту міжнароднага класа па сучаснаму пяцібор'ю, пераможца маладзёжнага першынства свету Сяргей Коршун, майстар спорту міжнароднага класа па боксу, бронзавы прызёр чэмпіянату свету Міхаіл Савічаў.

У ліку лепшых спартсменаў года называліся таксама майстры спорту па акадэмічнаму веславанню студэнткі нашага універсітэта Наталля Стасюк і Галіна Аўдзяйчук.

ЦЫРК

## ЭКЗОТЫКА І СМЕХ

Кіпяць палітычныя страсці, трашчыць па ўсіх швах эканоміка.Здаецца, не да весялосці ў наш цяжкі час. І тым, не менш, ёсць у нашым горадзе астравок, куды паранейшаму з ахвотай ідуць людзі. Гэта -- цырк! У цырку ж усё -- ад музыкі аркестра да самага складанага трука на арэне -- разлічана на тое, каб чалавек акунуўся ў атмасферу цуда, экзотыкі і радасці. Менавіта таму новая цыркавая прагрaма, якая пачалася з 4 лютага, так і называецца -- "Экзотыка і смех".

Гэтая праграма на працягу чатырох месяцаў прайшла з вялікім поспехам у Італіі. Аснову яе складае атракцыён "Дрэсіраваныя малпы" пад кіраўніцтвам Тамары Шаціравай. Забаўляльныя малпы танцуюць, ходзяць па канату, выконваюць складаныя трукі.

А з'яўленне на арэне дзікабразаў, папугаяў, галубоў, сабачак, удаваў выклікае несумненную цікавасць не толькі дзяцей, але і дарослага гледача да гэтай экзатычнай жывёлы.

За дзве гадзіны праграмы вы сустрэнецеся з даволі-такі рэдкімі нумарамі "Гімнаст на швунгтрапе", эквілібрыстамі з першамі на мачце, жанглёрам, акрабатамі-эксцэнтрыкамі.

І, вядома ж, увесь вечар на арэне будуць клоуны -- Юрый Баннікаў і Валерый Яшын, убачыўшы якіх, ад смеху не стрымаецца нават самы сур'ёзны глядач. Таму мы чакаем цябе, наш глядач, мы падрыхтавалі сапраўднае свята! Прыходзь і ты не пашкадуеш.

А.БУДНІЦКІ.


ФІРМА "ФАЛ" ПРАПАНУЕ

наступныя віды паслуг:

камерцыйныя паездкі ў Венгрыю -- 195 тыс. руб., у Ужгарад -- 154 тыс. руб.

Для жадаючых адпачыць ёсць пуцёўкі ў санаторый "Рамантыка" /Клёнкі/ на 3 дні /пятніца, субота, нядзеля/. Пражыванне ў 2-х і аднамесных нумарах. Да паслуг адпачываючых: сауна, більярд, бар, дыскатэка.

Кошт пуцёўкі -- 62 тыс.руб.

Даведкі па телефонах: 55-70-86, 53-29-73.


## ПАВАЖАНЫЯ ВЕТЭРАНЫ ВАЙНЫ, ПРАЦЫ І ЎЗБРОЕНЫХ СІЛ!

24 лютага 1994 г. ў ауд. 3-2 галоўнага корпуса універсітэта адбудзецца справаздачна-выбарны сход пярвічнай арганізацыі ветэранаў ГДУ імя Ф.Скарыны.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Справаздача Савета ветэранаў аб рабоце за перыяд з красавіка 1992 г. па сакавік 1994 г.
2. Выбары новага саставу Савета ветэранаў.
3. Выбары дэлегатаў на справаздачна-выбарную канферэнцыю ветэранскай арганізацыі Цэнтральнага раёна г.Гомеля.

Пачатак канферэнцыі ў 15 гадзін.

Яўка членаў пярвічнай арганізацыі ветэранаў абавязковая.

САВЕТ ВЕТЭРАНАЎ



ЗІМОВАЕ РАЗДОЛЛЕ

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

- беларускай культуры - старшага выкладчыка;
- вышэйшай матэматыкі - дацэнта, асістэнта;
- гісторыі Беларусі -- старшага выкладчыка;
- філасофіі -- дацэнта;
- біялагічны факультэт - дэкана.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней аднаго месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул. Савецкая, 104.

РЭКТАРАТ.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, Савет ветэранаў вайны і працы, калектыў кафедры філасофіі глыбока смуткуюць з выпадку смерці былога асістэнта названай кафедры, палкоўніка ў адстаўцы **ЕРМАЛАЕВА Якава Раманавіча** і выказваюць спачуванне яго родным і блізкім.

Рэктарат, АГЧ, калектыў бухгалтэрыі, Савет ветэранаў вайны і працы глыбока смуткуюць з выпадку смерці былога намесніка галоўнага бухгалтара **БОНДАРАВАЙ Тамары Адольфаўны** і выказваюць спачуванне яе родным і блізкім.


Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

"Гомельскі універсітэт" -- газета Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Рэгістрацыйны № 221

Спонсары газеты -- Цэнтральны райсавет народных дэпутатаў г. Гомеля; НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, адрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук".

Рэдактар Ул. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 83 .
Падпісана да друку 17.02.94.